зованностью и творческими способностями. В концепциях М. Кастельса и Р. Ф. Абдеева отмечается, что технологическая революция служит двигателем перемен в «информационную эпоху». По мнению П. Дракера и А. Д. Урсула, власть и контроль переходят от обладателей капитала к тем, кто обладает знанием, информацией и эффективными технологиями их использования.

В Республике Беларусь развитие информационного общества является национальным приоритетом, закрепленным на уровне программных документов. Многие задачи развития информатизации решены, о чем свидетельствуют оценки международных организаций, осуществляющих соответствующий мониторинг. Однако Беларусь отстает от государств-лидеров по таким показателям, как коэффициент изобретательской активности, удельный вес инновационных товаров и услуг, экспорт наукоемких услуг в силу ряда экономических причин. На данный момент продолжают приниматься меры для совершенствования ситуации в сфере информатизации государства и общества.

**К. Ясінская**

## АСАБЛІВАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ ВЕРСІІ ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛІЗМУ НА ПРЫКЛАДЗЕ ТВОРЧАСЦІ ВАСІЛЯ БЫКАВА

Экзістэнцыялізм – феномен культуры і філасофіі XX стагоддзя, які ўзнікае пасля Першай сусветнай вайны ў якасці спробы стварыць новую канцэпцыю сутнасці існавання чалавека. Прыйшоў на змену філасофіі жыцця і распаўсюдзіўся сярод навукоўцаў, што імкнуліся набыць такую апору ва светаўспрыманні, якая б не паддавалася зменлівасці жыцця. Яскравыя прадстаўнікі экзістэнцыялізму ў Заходняй Еўропе – К. Ясперс, М. Хайдэгер, Ж.-П. Сартр, А. Камю. Філасофія экзістэнцыялізму акцэнтуе ўвагу на індывідуальным быцці кожнага чалавека. Экзістэнцыялісты сцвярджаюць, што існаванне папярэднічае сутнасці, то-бок чалавек нараджаецца свабодным і на працягу свайго існавання робіць выбар, які вызначае яго сутнасць. Асобую праблему у экзістэнцыялізме складаюць пытанні наконт пераходу ад несапраўднага існавання да сапраўднага (экзістэнцыі). Пераход да экзістэнцыі часта здараецца ў памежных сітуацыях.

Васіль Быкаў – выдатны беларускі пісьменнік, мысліцель, творчасць якога мае велізарнае значэнне для нашай краіны і свету. Чалавек, які на працягу ўсяго свайго жыцця расплюшчваў людзям вочы на праўду, паказаў падзеі XX стагоддзя ў сапраўдным абліччы. Мастак слова, які быў надзелены талентам глыбіннага пранікнення ў чалавечую сутнасць, што дае падставы знаходзіць экзістэнцыяльныя матывы ў яго творчасці. Пісьменнік ставіць сваіх герояў у памежныя сітуацыі, востра ўздымае праблему свабоды і яе

абмежавання, прапануе героям выбар паміж жыццём і смерцю, але часцей паміж смерцю і, зноў-такі, смерцю. Творы Васіля Быкава прасякнуты глыбокім псіхалагізмам, бо аўтар аналізуе ўнутраны свет чалавека, яго памкненні, пачуцці, думкі – усё, што складае сапраўднае існаванне асобы.

У аповесці «Сотнікаў» Васіль Быкаў уздымае праблему адказнасці людзей за іх уласны выбар, высвятляе прычыны маральнага падзення, здрадніцтва адных і духоўнай велічы, высакароднасці другіх. Героі робяць выбар паміж жыццём і смерцю – знаходзяцца ў памежнай сітуацыі. Сотнікаў выбірае памерці, але захаваць сваю сутнасць, перайсці да сапраўднага існавання. Рыбак абірае жыццё, але дзеля гэтага ідзе на здраду. Ні адзін герой, ні другі не адчуваюць палёгкі або ўнутранай разняволенасці пасля зробленага выбару.

Беларуская версія экзістэнцыялізму – песімістычная філасофская канцэпцыя, якая сцвярджае, што ніякае дзеянне не дазволіць чалавеку жыць, калі свабода абмежаваная. Дзеянне прыводзіць да чарговага тупіка, з якога няма выйсця. У такіх умовах чалавек не можа выбраць сябе, стварыць сябе. Гэтым Васіль Быкаў паказвае жорсткасць і бесчалавечнасць таталітарнага рэжыму, які пазбаўляе чалавека свабоды.